Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЛЮТАГА 2017 г. СУБОТА № 34 (28398)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Ці дапаможа ранняе браніраванне сэканоміць?**
СТАР. 5



**Успаміны пра Міхаіла Савіцкага**
СТАР. 7



**Экскурсія ў ... склеп**
СТАР. 8

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«Для падтрымкі малога прадпрымальніцтва стаіць задача па стварэнні ў краіне гарантыйнага фонду. Доступ да фінансавых рэсурсаў заўсёды быў праблемай для развіцця малога і сярэдняга бізнесу. Стварэнне гарантыйнага фонду вырашыць гэтую праблему для тых, у каго ёсць эфектыўныя акупныя праекты, але не хапае ўласных сродкаў».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +2° |
| Віцебск | +2° |
| Гомель | +2° |
| Гродна | +3° |
| Магілёў | +2° |
| Мінск | +2° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8731 | ▲ |
| Еўра | 1,9952 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0692 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# КАПЕЖ У ЛЯДОВЫМ ЦАРСТВЕ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сямігадовы мінчанін Кірыл Бяззубаў каля ледзяных фігур ваўка і ваўчыцы, якіх выразалі ўдзельнікі пленэру «Свет крысталаў» у сталічным Батанічным садзе. Нечаканыя лютаўскія плюсавыя тэмпературы надвор'я могуць хутка знішчыць гэтую казачную прыгажосць.

*Больш здымкаў глядзіце на партале «Звязды» www.zviazda.by*

■ Спецыяльны рэпартаж

## НА СЛУЖБЕ БОГУ І ЛЮДЗЯМ

### Пяць сясцёр ордэна маці Тэрэзы ратуюць бяздомных цэлага горада

**Стас 25 гадоў працаваў у Тульскім заапарку, а цяпер разам з жонкай начуе на вуліцы. Любоў Цімафееўна мае дах над галавой, але грошай на пражыванне з цяжкасцю хапае: рада, калі ў дзень перападзе талерка супу з лустай хлеба. Лёня — той увогуле ледзь не апынуўся на тым свеце: ачуўся, калі бацюшка яго адпяваў... Яны і яшчэ дзясяткі людзей не прапалі, напэўна, толькі дзякуючы сёстрам каталіцкага ордэна маці Тэрэзы, якія забяспечваюць абяздоленых ежай, лекамі і малітвамі. Такіх манашак у Беларусі ўсяго пяць — яны жывуць у гомельскім Доме міласэрнасці і кожны дзень служаць Богу і людзям.**
СТАР. 4



Фота Надзеі БУЖАН.

Сястра Грэйс раздае абед. Сёння ў меню — свежая капуста.

■ Арэнда жылля

## Кватарантаў ізноў не хапае

### Спецыялісты не выключаюць, што да вясны здымныя бюджэтныя кватэры могуць яшчэ патаннець

**Зіма на другасным рынку прыватнай арэнды ніколі не была спрыяльным сезонам для кватэраздатчыкаў. Сёлета халодны перыяд стаў увогуле складаным для ўласнікаў свабоднага жылля, бо колькасць кліентаў у гэты час не павялічваецца, заробкі ў патэнцыйных кватарантаў не растуць, больш таго — менавіта ў студзені павялічыліся тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі. Пералічаныя фактары падштурхоўваюць удзельнікаў рынку арэнды да далейшага патаннення здымнага жылля.**



Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказала **начальнік аддзела арэнды агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ.**

### Гаспадары згаджаюцца на зніжкі

За апошнія паўтара года цэны на арэнду стандартнага жылля ў Мінску абваліліся амаль у два разы. Так, калі вясной 2015-га звычайныя аднапакаёвыя кватэры прапаноўваліся ў самым лепшым выпадку (для кватарантаў) за 300 долараў, то сёння падобнае жыллё здаецца не даражэй чым за 160—170 «баксаў». Больш таго, цяпер спецыялісты адзначаюць, што менавіта гэтай зімой на рынку назіраецца павольная тэндэнцыя далейшага патаннення сярэдніх па якасці кватэр, стаўкі па якіх раней былі вышэйшыя, чым у бюджэтным сектары жылля. Гэта не імгненнае патанненне, а хутчэй карэкцыроўка цэннікаў. Так, спачатку гаспадар утульнага жылля выстаўляе яго ў агульным каталогу па адной цане, але праз два-тры тыдні (калі кватэрай ніхто не цікавіцца) уласнікі ўжо згаджаюцца на зніжку ў памеры 10—20 долараў ад стартавай стаўкі.
СТАР. 3